Сегодня от костёла Иоанна крестителя остался только фундамент, костёлу во имя Непорочного зачатия повезло больше, частично сохранился первый этаж, но сооружение не стабильно и продолжает разрушатся под влиянием природных факторов. К сожалению Брест не обладает достаточными ресурсами для восстановления данных храмов, именно поэтому никто не ждёт скорого восстановления данных архитектурных памятников.

УДК 909 (476)

Студ. А.С. Вараб’ёва
Навук. кір. дац. В.М. Астрога
(кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ)

# “УСЕ ШЛЯХІ ВЯДУЦЬ НЕ ДА РЫМА, А ДА РОДНЫХ ВЕРБАЎ І БЯРОЗ”

*Куточак адзіны ў свеце,*
*Скуль першы і крык мой, і крок,*
*Мяне ты заўсёды прывеціш,*
*Цябе я пазнаю здалёк...*

Рана ці позна, але немаўля вырастае. А калі крыху набярэцца розуму, то задае сабе і іншым пытанне: адкуль я прыйшоў у гэты свет? Хто мае продкі? Гэта куток, куды хочацца заўсёды вярнуцца. Чаму гэта месца так цягне да сабе? Напэўна, таму, што чалавек упершыню тут убачыў сонца, пачуў шум дажджу, пайшоў у школу, здабыў сяброў. Такі куток, мілы майму сэрцу, ёсць і ў мяне. Куток майго дзяцінства і юнацтва – гарадскі пасёлак Акцябрскі Гомельскай вобласці, прыгожы, сціплы і непаўторны.

Сучасны г.п.Акцябрскі быў створаны ў выніку абяднання трох населеных пунктаў – Карпілаўка, Рудні і Радабелкі, дзе Рудабелцы была адведзена галоўная роля. Дадзены герб зяўляецца “размаўляючым”: у яго сімволіку закадзіравана назва “Рудабелка” (“Рудыя белкі”). Колькасць вавёрак на гербе – колькасць населеных пунктаў, у выніку абяднання якіх узнік цяперашнім Акцябрскі.

У назве пасёлка і яго далейшым лёсе цесна перапляліся гісторыя і сучаснасць. Першая пісьмовая згадка сяла Рудабелка адносіцца да 1507 года. У 1516 г. Рудыя Белкі былі пацверджаны Мікалаю Радзівілу «на вечнасць». У 1661 г. ў сяле былі царква, карчма, млын, кузня, дзе выплаўлялі жалеза. Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай беларускія землі, а разам з імі і Рудабельшчыны, увайшлі ў склад Расійскай імперыі. У 18-19 ст. Рудабелка належыла дваранскаму роду Лаппа, адзін з прадстаўнікоў якога, Міхаіл Лапо, быў удзельнікам паўстання дзекабрыстаў. Пасля адмены прыгоннага права на тэрыторыі Рудабелка

было 5 памешчыцкіх маёнткаў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Рудабелцы 22 лістапада 1917 г. быў створаны рэўкам на чале з Аляксандрам Салаўём. Сёння іх імёнамі названы вуліцы ў гарадскім пасёлку, імя А.Р.Салаўя носіць сярэдняя школа №1.

Гісторыя Акцябрскага раёна цесна звязана з гераічнымі падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. У тыя гады Акцябрскі раён стаў цэнтрам партызанскага руху. У першы дзень вайны, 22.чэрвеня 1941 г., быў створаны партызанскі атрад «Чырвоны Кастрычнік». Арганізатарамі партызанскага руху былі Бумажкоў Ц. П. і Паўлоўскі Ф.І. Яны 6 жніўня 1941 г. удастоены звання Героя Савецкага Саюза. У гады вайны ў г.п. Акцябрскі знаходзіўся цэнтр Акцябрска-Любанскай партызанскай зоны, захоўвалася савецкая ўлада, працавалі школы, электрастанцыя, майстэрні. 27 чэрвеня 1944 г. войскамі першага Беларускага фронту раён быў вызвалены ад акупантаў.

Рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі нашых землякоў захаваныя ў аповесці С. Грахоўскага «Рудабельская рэспубліка», у карцінах народнага мастака Беларусі Л. Маісеенкі (ураджэнца раёна), у дакументальных фільмах «Рудабелка. Год 41-й», «Камісар Бумажкоў» (рэж. І.Дабралюбаў) і інш.

Зараз Акцябрскі – эканамічны, культурны і спартыўны цэнтр. Тут дзейнічае ўласны завод сухога абястлушчанага малака. Завод функцыянуе з 28 снежня 1972 г. Асартыментны пералік уключае ў сябе больш за 20 найменняў прадукцыі, сярод якіх натуральнамалочная прадукцыя, масла, сухія малочныя прадукты і заменнікі суцэльнага малака.

У раёне функцыянуе 21 установа адукацыі: 4 – дашкольнай адукацыі, 14 – агульнай сярэдняй адукацыі, Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, Цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі, сацыяльна-педагагічны цэнтр і 2 установы фізічнай культуры і спорту.

Адным з характэрных месцаў не толькі для адпачынку жыхароў г.п. Акцябрскі, але і гасцей з розных куткоў Беларусі і далёкага замежжа з'яўляецца заапарк (тэрыторыя складае 1.77 га). Ён змяшчае і экспануе калекцыі больш за 70-ці відаў птушак і жывёл, што складае 261 асобнік.

Для правядзення спартыўна-масавай і аздараўленчай работы ў раёне ёсць спартыўная база: стадыён на 600 месцаў з комплексам спартыўных пляцовак, 16 спартыўных залаў, 46 спартыўных пляцовак, басейн на 20 метраў. З 2006 года ў раёне функцыянуе дзяржаўная ўстанова «Дзіцяча-юнацкая спартыўная школа Акцябрскага раёна».

Пройдзе час. Мой пасёлак зменіцца. Ён стане яшчэ больш прыгожым, утульным. Хацелася б, каб людзі з іншых мясцін прыязджалі да нас, дзівіліся і гаварылі пра наш край як пра цудоўны райскі куток.

Шчодрая зямля наша Акцябрская, таму, хто жыве ўсімі яе турботамі і клопатамі, болем і радасцю, хто не адрываецца ад родных каранёў, надае сілы зямля гэта чароўная.

Хоць зараз я жыву ў Мінску, але я вельмі ўдзячна лёсу, што нарадзілася менавіта на гэтай палескай зямлі, што тут зрабіла свае першыя крокі, што адсюль павяла мяне жыццёвая сцяжынка, якая заўсёды будзе чакаць майго вяртання.

ЛІТАРАТУРА

1. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Акцябрскага раёна. – Менск: БЕЛТА, 1997. -- 478 с.

УДК 908 (476.1)

Студ. С.С. Тышкевіч
Навук. кір. дац. В.М. Астрога
(кафедра гісторыі Беларусі і паліталогіі БДТУ)

## ЛЁСАМ ЗВЯЗАНЫ З РОДНЫМ КРАЕМ (З ГІСТОРЫІ ВЁСКІ ДЗЕРАЎНАЯ СТАЎБЦОЎСКАГА РАЁНА)

Мая малая радзіма – вёска Дзераўная Стаўбцоўскага раёна. Яе назва пайшла, напэўна, ад слоў «дзёрн» або «дзірван», што перш за ўсё тут, у пушчы, азначала месца раскарчоўкі лесу. Дзераўная з'яўляецца адным з найбольш старажытных паселішчаў на Стаўбцоўшчыне. Яна вядомая з пісьмовых крыніц першай паловы XV ст. як маёнтак кашталяна віленскага Сямёна Гедыголдавіча. 3 1525 г. вялікі князь літоўскі Жыгімонт I дазваляе Мікалаю Кежгайлу заснаваць у маёнтку Дзераўная мястэчка і наладзіць там торг і корчмы. Пасля смерці ў 1554 г. апошняга з Кежгайлаў, Станіслава, Дзераўная пераходзіць да іх нашчадка Яна Завішы. У канцы XVI ст. маёнтак ўяўляў сабой комплекс жылых гаспадарчых будынкаў. У сядзібным доме знаходзілася зброя, каштоўныя рэчы, кнігі. На тэрыторыі маёнтка размяшчалася верф (“сточня”) для будаўніцтва рачных караблёў. 3 90-х гг. XVI ст. Дзераўная і 8 навакольных вёсак становяцца ўласнасцю Мікалая Крыштафа Радзівіла (Сіроткі). У 1646 г. у Дзераўной быў 71 двор, а сярод яе жыхароў значылася 26 рамеснікаў: цесляры, сталяры, шкляры, краўцы, млынары і іншыя. У XVIII стагоддзі на беразе Шуры стаяла шліфоўня Ганны Радзівіл. Рака прыводзіла ў дзеянне механізм мануфактуры. Замежныя і мясцовыя майстры выраблялі там каралеўскія пячаткі і аздобу для зброі. У пачатку XVIII ст. будуецца касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі. Верагодны будаўнік касцёла – віленскі канонік Войцех Сялява. Да нас дайшлі імёны народных